ВікіпедыЯ
Свабодная энцыклапедыя

ВікіпедыЯ

Ігар Васільевіч Ляшэнка

З Вікіпедыі, свабоднай энцыклапедыі

І́гар Васі́льевіч Ляшэ́нка (нар. 5 лістапада 1974, г. Ачамчыра, Абхазская АССР, Грузінская ССР) — беларускі дзяржаўны дзеяч. Намеснік Прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь (2018—2020). Генеральны дырэктар ААТ «Гродна Азот» (з 2021).

Біяграфія

Нарадзіўся 5 лістапада 1974 года ў г. Ачамчыра Абхазскай АССР Грузінскай ССР.

У 1996 годзе скончыў эканамічны факультэт Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Са студзеня 1997 года працаваў на Гомельскім хімічным заводзе. Займаў пасаду інжынера аддзела маркетынгу, затым начальніка планава-эканамічнага аддзела. У 2006 годзе ўзначаліў хімзавод.

10 верасня 2013 года быў прызначаны першым намеснікам старшыні, а 28 ліпеня 2014 года — старшынёй канцэрна «Белнафтахім»[4].

18 жніўня 2018 года прызначаны Намеснікам Прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь[5]. 3 сакавіка 2020 года вызвалены з пасады ў сувязі з пераходам на іншую работу[6].

3 мая 2020 года Ляшэнка кіраваў прадстаўніцтвам «Гомельтранснафта Дружба» ў Мінску.

26 студзеня 2021 года прызначаны генеральным дырэктарам ААТ «Гродна Азот»[7].

Ігар Васільевіч Ляшэнка

Генеральны дырэктар ААТ «Гродна Азот»

з 26 студзеня 2021

Намеснік Прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь

18 жніўня 2018 — 3 сакавіка 2020

Прэзідэнт	Аляксандр Лукашэнка
Кіраўнік урада	Сяргей Румас
Папярэднік	Уладзімір Сямашка
Пераемнік	Юрый Віктаравіч Назараў

Нараджэнне	5 лістапада 1974[1][2] (49 гадоў) Ачамчыра, Грузія[1]
Адукацыя	Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны (1996)[1] Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь[3]
Дзейнасць	палітык
Месца працы	Гомельскі хімічны завод Белнафтахім

Санкцыі ЗША

9 жніўня 2021 года Ляшэнка як дырэктар ААТ «Гродна Азот», прадпрыемства канцэрна «Белнафтахім», якое належыць або кантралюецца Аляксандрам Лукашэнкам, быў уключаны ў санкцыйны спіс спецыяльна прызначаных грамадзян і заблакіраваных асоб ЗША[8][9].

Зноскі

1. https://naviny.by/new/20200303/1583226066-nazarova-naznachili-vice-premerom-lyashenko-osvobodili-ot-dolzhnosti (https://naviny.by/new/20200303/1583226066-nazarova-naznachili-vice-premerom-lyashenko-osvobodili-ot-dolzhnosti)
2. https://sputnik.by/politics/20180818/1037170331/igor-lyashenko-vice-premer-biografiya.html (https://sputnik.by/politics/20180818/1037170331/igor-lyashenko-vice-premer-biografiya.html)
3. https://azot.by/about/istoriya-predpriyatiya/direktora/ (https://azot.by/about/istoriya-predpriyatiya/direktora/)
4. Ляшенко назначен главой "Белнефтехима" (https://news.tut.by/economics/408749.html) (руск.) (недаступная спасылка). TUT.BY (28 ліпеня 2014). Архівавана (https://web.archive.org/web/20171230110111/https://news.tut.by/economics/408749.html) з першакрыніцы 30 снежня 2017.
5. Александр Лукашенко сменил руководство Правительства, Премьер-министром назначен Сергей Румас (http://www.pravo.by/novosti/obshchestvenno-politicheskie-i-v-oblasti-prava/2018/august/30091/?sphrase_id=708744) (руск.). Национальный центр правовой информации Республики Беларусь (18 жніўня 2018).
6. Ігар Ляшэнка вызвалены ад пасады Намесніка Прэм'ер-міністра Беларусі (http://president.gov.by/by/news_by/view/igar-ljashenka-vyzvaleny-ad-pasady-namesnika-premer-ministra-belarusi-23168/) (бел.). Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Праверана 05.03.2020.
7. Былы віцэ-прэм’ер Ляшэнка ўзгоднены на пасаду гендырэктара «Гродна Азота» (https://blr.belta.by/president/view/byly-vitse-premer-ljashenka-uzgodneny-na-pasadu-gendyrektara-grodna-azota-96076-2021/)
8. Treasury Holds the Belarusian Regime to Account on Anniversary of Fraudulent Election (https://home.treasury.gov/news/press-releases/jy0315) (англ.). Міністэрства фінансаў ЗША (9 жніўня 2021). Архівавана (https://web.archive.org/web/20210809161340/https://home.treasury.gov/news/press-releases/jy0315) з першакрыніцы 9 жніўня 2021. Праверана 10 жніўня 2021.
9. США расширили санкции в отношении официального Минска. Полный список (https://news.zerkalo.io/economics/1392.html) (руск.). zerkalo.io (9 жніўня 2021). Архівавана (https://web.archive.org/web/20210809213314/https://news.zerkalo.io/economics/1392.html) з першакрыніцы 9 жніўня 2021. Праверана 10 жніўня 2021.

Спасылкі

- Старонка на сайце Савета Міністраў Беларусі (http://www.government.by/be/lyashenko/) Архівавана (https://web.archive.org/web/20200223194527/http://www.government.by/be/lyashenko/) 23 лютага 2020..

Узята з "https://be.wikipedia.org/w/index.php?title=Ігар_Васільевіч_Ляшэнка&oldid=4259479"